УДК 02(09)476.4)

АРЦЕМ’ЕЎ ВІКТАР ІВАНАВІЧ,
празаік, публіцыст, краязнаўца,
член Саюза пісьменнікаў Беларусі, ветэран працы
г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь

# ШЧОДРАСЦЬ ДУШЫ ДЗЯМ’ЯНА РАМАНАВІЧА НОВІКАВА

Мяне звязвалі і звязваюць з бібліятэкай Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі даўнія прафесійныя сувязі і сяброўскія адносіны. Усе мае кнігі маюцца ў фондзе бібліятэкі, шмат з іх у электронным выглядзе размешчаны ў электронным каталогу і даступны ў Інтэрнэце. Я прымаў удзел у напісанні зборніка пра бібліятэку да 175-гадовага юбілею. Маю непасрэднае дачыненне да падрыхтоўкі вялікай колькасці спецыялістаў бібліятэкі, бо на працягу многіх гадоў выкладаў у Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме. А першае маё знаёмства з бібліятэкай акадэміі і асабіста з Дзям’янам Раманавічам адбылося вельмі даўно.

У пяцідзясятыя і шасцідзясятыя гады мінулага ўжо стагоддзя працаваў я інспектарам па бібліятэках Упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама, а потым загадчыкам метадычнага аддзела абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна. Зрэдку праводзіліся семінары бібліятэкараў усіх ведамстваў, у тым ліку і вышэйшых навучальных устаноў. Тады сустракаў там і дырэктара бібліятэкі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі з Горак Дзям’яна Раманавіча Новікава. Для нас, маладзейшых і зусім маладых, ён выглядаў як мамант: вучоны, заслужаны дзеяч культуры БССР. Маладых выступоўцаў ён слухаў уважліва. Сам выступаў рэдка. Але слова яго было кароткае і ёмістае. Прапановы яго былі слушныя і заўсёды знаходзілі падтрымку аўдыторыі. Я вельмі паважаў яго. Ды і ў іншых калег ён меў вялікі аўтарытэт. Вольнай хвіліны на семінарах не было, і грунтоўна пагутарыць нам не выпадала.

І вось на пачатку верасня 1964 г., калі працоўны стаж Дзям’яна Раманавіча мінуў за 40 гадоў, прыехаў я ў Горкі ў камандзіроўку. Мне закарцела наведацца ў знакамітую бібліятэку БСГА. Мае калегі з раённай бібліятэкі папярэдзілі, што днём дырэктар бібліятэкі заняты са студэнтамі, а на работу прыходзіць разам з усходам сонца.

Біблятэка Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі – адна са старэйшых бібліятэк зямлі Магілёўскай. На яе кніжных паліцах амаль мільён кніг. Тут выданні нашай і сацыялістычных краін, а таксама часопісы і навуковыя працы з Канады, ЗША, Швецыі, Нарвегіі, Францыі… Выданняў так многа, што іх дастаўляюць два паштальёны. Чытачоў у бібліятэцы больш за восем тысяч.

Вядома, не кожны адразу ўбачыць тую велізарную крапатлівую працу, якая хаваецца за гэтымі лічбамі. Мне ж і раней даводзілася бачыць, колькі энергіі, сіл і часу аддае Дзям’ян Раманавіч прапагандзе сельскагаспадарчай кнігі. Ведаю і пра тое, што ён аматар кветак. А вось прыгажосць яго душы, сапраўдную чалавечнасць, любоў да людзей з найбольшай выразнасцю і сілай аддчуў толькі цяпер, калі зайшоў на тэрыторыю акадэміі і ўбачыў будынак бібліятэкі.

Сонечны ранак. Яшчэ па-летняму зеляняюць шматвекавыя і маладыя дрэвы парку акадэміі. І кветкі, кветкі! Іх так многа ўсюды – самыя розныя. Большасць з іх бачу ўпершыню.

– Каму пакланіцца да зямлі і сказаць ад усёй душы “дзякуй”! – пытаюся ў прахожых, паказваючы рукой на кветкі.

– Ды Дзям’яну Раманавічу, вучонаму нашаму!

Яшчэ больш закарцела ўбачыць яго самога і асабіста выказаць удзячнасць.

Шукаць доўга не давялося. Хаця было яшчэ далёка да дзевяці гадзін, а Дзям’ян Раманавіч ужо на тэрыторыі акадэмічнага гарадка.

– Здзіўлены? – засмяяўся ён. – Такі ўжо ў мяне распарадак дня: у 6 гадзін раніцы – у парк. Прайду з паўкруга ды гадзіны на паўтары – дзве за працу – самы прадукцыйны час, ніхто не перашкаджае.

Крыху пагутарыўшы пра кветкі і паркавыя дрэвы, Дзям’ян Раманавіч заспяшаўся:

– Пойдзем у бібліятэку, а то людзі будуць чакаць.

У сваім рабочым кабінеце дырэктар за якія-небудзь паўгадзіны вырашыў дзясяткі пытанняў, а пытанні самыя розныя: і афармленне бібліятэкі, і абмен кнігамі з бібліятэкамі іншых краін, і збор гербарыя для краязнаўчага музея, і кансультацыя для Віцебскага зеленгаса, як засцерагчы кветкі ад шкоднікаў, і многае іншае.

По дапамогу звяртаюцца супрацоўнікі бібліятэкі, чытачы, работнікі паркавай гаспадаркі, а то і проста аматары-кветкаводы.

Ідуць па параду, падзяліцца думкамі. Часта звоняць па тэлэфоне. Нярэдка званкі іншагароднія.

– На жымаласці татарскай шкоднікі! – устрывожана паведаміў адзін з работнікаў паркавай гаспадаркі.

– Ведаю ўжо. Каля іншых установ райцэнтра такая ж з'ява. І з раёнаў суседніх абласцей званілі. Прымаем меры.

Адна са студэнтак папрасіла адшукаць некалькі патрэбных кніг.

– А што вам адказалі ў даведачна-бібліяграфічным аддзеле? – удакладніў Дзям'ян Раманавіч.

– А я прама да вас, ведаю, што памяць у вас добрая, адразу ўспомніце, а ў мяне часу вельмі мала.

– Карыстаецеся маёй слабасцю, – жартам заўважыў ён.

Як толькі студэнтка выйшла, я не ўтрымаўся:

– Скажыце, калі ласка, Дзям'ян Раманавіч, сапраўды, як гэта вы можаце ўсё помніць?

– Ніякага сакрэту няма. Бачыце бланкі заказаў, анатаваныя карткі і кнігі – вось яны стаяць. Такім чынам я з кожнай кнігай знаёмлюся тройчы: першы раз, калі заказваю кнігу, – у бланку заказаў ёсць кароткія звесткі, другі раз чытаю анатаваную картку, – у ёй сказана, што за кніга і каму яна карысная, а трэці раз – трымаю ўжо кнігу ў руках.

Нарэшце прыём наведвальнікаў завершаны. Дзям'ян Раманавіч паказвае мне кабінеты супрацоўнікаў, абанемент і шэраг чытальных залаў. А потым мы заходзім у кнігасховішча. І на твары, і ў голасе яго адчуваўся гонар за зробленае ў бібліятэцы на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў упартай працы. У кнігасховішчы мы затрымаліся даўжэй. Я ўбачыў, што дырэктар бібліятэкі добры і ўважлівы гаспадар, разумны і дапытлівы: кнігасховішча спланавана проста, эканомна і разам з тым утульна.

– Вось бы яшчэ транспарцёрную стужку, каб з чацвёртага яруса не насіць у руках кніг, – выказвае сваю думку гаспадар.

Дзям'ян Раманавіч паказваў рарытэты і кнігі славутых вучоных, у тым ліку працы Вільямса і іншых травапольшчыкаў, як іх называлі пры Хрушчове. А потым, агляну ўшыся, каб выпадкова хто-небудзь не пачуў нашу гамонку, ціха, але як клятву, прамовіў:

– Зверху загадам патрабуюць спісаць па акце гэтую літаратуру, але я не буду магільшчыкам кніг і захаваю навуковы фонд!

Як закончылі экскурсію па бібліятэцы, Дзям'ян Раманавіч павёў грунтоўную і цікавую гутарку пра сустрэчы з Янкам Купалам, Максімам Гарэцкім і іншымі вядомымі беларускімі пісьменнікамі.

У Янкі Купалы з Д. Р. Новікавым былі шчырая прыязнасць і дружба яшчэ з пачатку працы ў бібліятэцы. І паэт у кожны свой прыезд у Горкі меў з ім сустрэчу, быў дома ў яго госцем. І 30 чэрвеня 1941 г. паэт, пакідаючы Беларусь, зрабіў у Горках прыпынак. Доўга затрымлівацца яму не было калі. Ён толькі забег да сябра на працу. Дзям'ян Раманавіч запрасіў яго на кватэру, каб разам паабедаць. Паэт даў згоду. Гаспадар прапанаваў і начлег, але Янка Купала спаслаўся на тое, што трэба спяшацца і яшчэ днём наведацца ў вёску Горы. Яны развіталіся… назаўсёды.

Пра сябе Дзям'ян Раманавіч гаварыў вельмі скупа. Яму ўжо 67 гадоў. Было 22 гады, калі прыйшоў у бібліятэку акадэміі. Працуе тут 45 гадоў. Яшчэ да вайны атрымаў медаль: "За працоўную адзнаку". Ваяваў – франтавік. Потым зноў бібліятэка. 37 гадоў вядзе паркавую гаспадарку, якой ганарыцца акадэмія. І працуе ён не штатным работнікам, а бясплатна, на грамадскіх асновах.

Прайшлі гады. Дзям'ян Раманавіч працаваў самааддана да дня расстання з жыццём. Калі давялося зноўку наведаць Горкі, адразу пайшоў у акадэмічны гарадок, пахадзіў тымі сцяжынкамі, якімі хадзіў Дзям'ян Раманавіч, яшчэ раз убачыў унікальную прыгажосць, якую стварыў незвычайна шчодрай душы чалавек. А потым пайшоў на кладзішча, каб пакланіцца яго магіле і ўскласці на яе кветкі, якія ён любіў да самазабыцця. Магілу знайшоў па падказках яго калег: па тым часе Дзям'яну Раманавічу Новікаву на кладзішчы быў пастаўлены самы прыгожы помнік.

Сапраўды, помнік велічны і прыгожы, як ягоныя сэрца і душа. І вельмі добра, і заслугоўвае усялякай павагі тое, что супрацоўнікі акадэмічнай бібліятэкі захоўваюць памяць аб сваім знакамітым калегу. Уражвае тая, можа, не заўсёды прыкметная, вялікая праца, якая праводзіцца імі на працягу ўсіх гэтых гадоў. І тое, што зараз найстарэйшая бібліятэка нашай краіны будзе насіць імя выдатнага чалавека, грамадзяніна і прафесіянала, сведчыць не толькі аб прызнанні заслуг Дзям'яна Раманавіча Новікава, але і пра пераемнасць пакаленняў і захаванне прафесійных традыцый.